Наталля НІКІЦІНА

# ШМАТГРАННЫ ТАЛЕНТ ПІСЬМЕННІКА

Васіль Юр'евіч Ткачоў — таленавіты пісьменнік і цудоўны, добры, аказны чалавек, які валодае пачуццём гумару.

Нарадзіўся Васіль Юр'евіч 1 студзеня 1948 г. у вёсцы Гута Рагачоўскага раёна. Вучыўся ў Ісканскай васьмігадовай школе Быхаўскага раёна. Пасля заканчэння Ільічоўскай СШ Рагачоўскага раёна (1966) працаваў у раённых газетах (г. Івацэвічы, г. п. Карма). У 1967 г. прызваны ў Савецкую Армію. Скончыў факультэт журналістыкі Львоўскага вышэйшага ваенна-палітычнага вучылішча (1973). Служыў ваенным карэспандэнтам у Сярэдняй Азіі. З 1980 г. жыве і працуе ў Гомелі: карэспандэнт шматтыражкі «Сельмашавец», стыліст і спецыяльны карэспандэнт абласной газеты «Гомельская праўда».

З 1989 г. член Саюза пісьменнікаў СССР і БССР. У 1989–2005 гг. — старшыня Гомельскага абласнога аддзялення Саюза Беларускіх пісьменнікаў. Цяпер член Саюза пісьменнікаў Беларусі. Удзельнічаў у рабоце IX з'езда Саюза пісьменнікаў СССР (Масква, 1992). Член Саюза тэатральных дзеячаў (2006).

У 2001–2003 гг. на абласным тэлебачанні вёў аўтарскую літаратурна-мастацкую праграму «На прызбе з Васілём».

Шмат твораў Васіля Юр'евіча друкавалася ва ўсесаюзных і рэспубліканскіх газетах і часопісах, а таксама размешчаны ў калектыўных зборніках. А вось першае апавяданне аўтара было надрукавана ў далёкім 1966 годзе на старонках часопіса «Вясёлка». Васіль Юр'евіч — лаўрэат шматлікіх літаратурных прэмій як у галіне дзіцячай літаратуры, так і ў галіне літаратуры для дарослых. Вось некаторыя:

- прэміі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі ў галіне літаратуры за кнігу прозы «Снукер» (2011),
- прэміі імя Васіля Віткі за ўклад у развіццё дзіцячай літаратуры (2012),
- абласной літаратурнай прэміі імя Аляксандра Капусціна (2000),
- літаратурнай прэміі імя Кірылы Тураўскага за кнігу п'ес «Последний» (2013),
- расійскай прэміі імя Баяна (2002),
- прэміі Саюза беларускіх журналістаў і міжнароднай прэміі «Дружба» за лепшы публіцыстычны твор (нарыс «Сонцам хлеб на стале»),
- п'еса «Стары і дарога» адзначана першай прэміяй на Рэспубліканскім конкурсе ў 1985 г.

Ён пераможца літаратурнага конкурсу часопіса «Вясёлка» на лепшае апавяданне.

Прымаў удзел ва ўсесаюзных нарадах драматургаў у Піцундзе, Рузе і Дубултах.

Узнагароджаны Ганаровай граматай Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь (2007) і Ганаровай граматай Гомельскага аблвыканкама (1998), знакам Саюза пісьменнікаў Беларусі «За вялікі ўклад у літаратуру»(2012).

У шматлікіх тэатрах Беларусі, Расіі, Казахстана, Украіны і Малдовы, на тэлебачанні і радыё ставяць п'есы Васіля Юр'евіча. У свой час пісьменнік прайшоў добрую школу драматургіі. Яго першы спектакль «Седой аист» быў прапанаваны гледачам у 1985 г. Магілёўскім абласным драматычным тэатрам, потым Гомельскім абласным былі пастаўлены «Окна». Зараз Васіль Ткачоў плённа працуе з Гомельскім абласным лялечным тэатрам, Маладзёжным тэатрам, Мозырскім драматычным тэатрам. Спектаклі па п'есах пісьменніка жывуць на сцэнах тэатраў, яны падабаюцца гледачам і, як кажа ён сам, калі бачыш плады сваёй працы, творчая энергія падвойваецца і з'яўляюцца сілы і ідэі напісаць нешта новае.

Трэба дадаць, што па выніках драматургічнага конкурсу «Армія Расіі: вайна ці мір», які быў прымеркаваны да 70-годдзя Перамогі, п'еса «Марш Шульгіна» прапанавана тэатрам Расіі, у тым ліку і ваенным, да пастановак.

Творы Васіля Юр'евіча перакладаліся на рускую, украінскую, польскую, туркменскую, удмурцкую і марыйскую мовы. Піша заўсёды па-беларуску, аднак кнігі на рускай мове таксама ёсць. На яго ліку больш як 20 кніг і каля 60 п'ес.

У творах пісьменніка ўсе героі — простыя людзі, якія жывуць звычайным жыццём, і з імі здараюцца незвычайныя сітуацыі.

Вось, напрыклад, у сваім творы «Дом камуны» пісьменнік расказвае пра самы звычайны дом у Гомелі, дзе жывуць розныя людзі, са сваімі клопатамі, часта са сваімі невырашальнымі праблемамі. Жыхары гэтага дома ствараюць адну вялізную сям'ю, і праз іх жыццё пісьменнік распавядае чытачам пра цэлую эпоху чалавечага жыцця. У некаторых творах Васіль Юр'евіч закранае тэму няпростых чалавечых адносін і кажа пра тое, як важна захоўваць у душы дабрыню, спагаду, чуласць.

Сябруе пісьменнік і з гумарам. У 2011 г. у Васіля Юр'евіча выйшла кніга гумару «Булачка» на трох мовах. Кніга змяшчае больш як 50 гумарэсак. Аўтар прапануе нам не толькі смяяцца з жартаў герояў, але і задумацца аб жыцці кожнага.

Жывыя і яскравыя творы выяўляюць багаты духоўны свет, дабрыню і чуласць пісьменніка, а таксама багацце душ яго герояў. Ёсць і яшчэ адно багацце — гэта мілагучная, простая родная беларуская мова, якая, нібы святая крыніца, ліецца са старонак яго твораў, дэруючы людзям гаючую сілу добрага настрою, гонару за Радзіму, бадзёрасці і дабрыні.

Асобныя апавяданні для дзяцей уключаны ў чытанкі для вучняў малодшых класаў.